скарачаецца колькасць беларускамоўных школ, народных дамоў, хат-чытальняў, змяншаецца выданне беларускіх кніг, справаводства ў розных установах пераводзіцца на рускую мову і інш.

Такім чынам, адмова ад новай эканамічнай палітыкі, агульны пераход да адмініcрацыйна-камандных метадаў кіравання грамадствам непазбежна прывялі да дэфармацыі ў нацыянальна-культурнай сферы. Беларусізацыю, як і шмат якія іншыя прагрэсіўныя пачынанні, моцна падарвала барацьба з г. зв. "нацдэмамі", а канчаткова яе задушылі рэпрэсіі 1930-х гг.

ЛІТАРАТУРА

1. Нацыянальны архіў РБ. Ф. 4, воп. 7, спр. 274.

2. Два гады нацыянальнай работы ў БССР: збор прамоў, артыкулаў і рэзалюцый па нацыянальнаму пытанню. – Мн.: Выд-ва Нацыянальнай камісіі ЦВК БССР, 1929. – 167 с.

3. Асноўныя вынікі работы ўраду БССР. Да перавыбараў Саветаў. 1928 – 1929. – Мн.: Выд-ва ЦВК і СНК БССР, 1929. – 150 с.

4. Практычнае вырашэнне нацыянальнага пытання ў БССР. – Мінск: Выд-ва Нацкамісіі ЦВК БССР. – ч. І. Беларусізацыя. – 1928. – 152 с.

5. Нацыянальны архіў РБ. Ф. 42, воп. 1, спр. 1584.

УДК 351.756(438)«1918/1939»

В.У. Коваль, дац., канд. гіст. навук,
(БДТУ, г. Мінск)

## СТРУКТУРА ДЗЯРЖАЎНЫХ ОРГАНАЎ ЭМІГРАЦЫЙНАГА АПАРАТУ ДРУГОЙ РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ

Даследаванне гісторыі эміграцыйнай міжваеннай хвалі беларускага насельніцтва вымушае спецыялістаў разглядаць як эканамічныя, палітычныя, псіхалагічныя аспекты, так і прававыя асаблівасці працэдуры эміграцыі. У Другой Рэчы Паспалітай праблемамі эміграцыі і рээміграцыі займаліся структуры Міністэрства працы і сацыяльнай апекі, Міністэрства замежных спраў, Міністэрства ўнутраных спраў, Міністэрства фінансаў, Міністэрства прамысловасці і гандлю.

Эміграцыйны апарат Польшчы фарміраваўся паэтапна, на яго дзейнасць значны ўплыў аказвала ўнутраная і знешняя палітыка дзяржавы. У 1919 г. было створана Дзяржаўнае бюро па працаўладкаванню пры Міністэрстве працы і сацыяльна апекі, якое з 1920 г. пачало падпарадкоўвацца Эміграцыйнаму

ўпраўленню [1, С. 346]. Упраўленне займалася пытаннямі рэкрутацыі і рээміграцыі эмігрантаў, збірала і аналізавала статыстычную інфармацыю пра інтэнсіўнасць эміграцыйных працэсаў, кантралявала працэдуру падпісання кантрактаў, арганізоўвала збор транспартных падаткаў.

Для аналітычнай работы і эфектыўнай каардынацыі эміграцыйных структур была арганізавана Эміграцыйная рада, якая стала спецыяльным калегіяльным органам. Вядома, што 9 чэрвеня 1921 г. рада распачала сваю дзейнасць у наступным складзе: 8 членаў рады прызначыў Міністр працы і сацыяльнай апекі, 8 членаў дэлегаваў Сейм, 3 прадстаўнікі былі з грамадскіх арганізацый, якія займаліся праблемамі эміграцыі [1, С. 348]. Прынцыповай умовай для кожнага члена Эміграцыйнай рады стала тэарэтычная ці практычная работа з эмігрантамі ці рээмігрантамі. У сярэдзіне 1920-х гг. орган быў рэарганізаваны ў Дзяржаўную эміграцыйную раду. Паступова са складу рады выключылі членаў грамадскіх арганізацый.

Незалежна ад Эміграцыйнага ўпраўлення працавала сетка польскіх амбасад і консульств, падпарадкаваная Міністэрству замежных спраў. З кожным годам павышалася роля і ўплыў Міністэрства замежных спраў у эміграцыйных органах і структурах на фоне зніжэння паўнамоцтваў іншых міністэрств.

У Канстытуцыі Польскай Рэспублікі ад 17 сакавіка 1921 г. была вызначана свабода асобы на эміграцыю, аднак узгаданы юрыдычны дакумент вылучыўся ў гісторыі права сваімі двайнымі стандартамі і дэкларатыўнасцю. Польская Канстытуцыя сведчыла, што кожны грамадзянін меў права выбіраць сабе на тэрыторыі дзяржавы месца жыхарства, пакідаць краіну, а таксама выбіраць свае прафесійныя заняткі і перавозіць маёмасць. На самой справе створаны дзяржаўны эміграцыйны апарат мэтанакіравана імкнуўся падпарадкаваць сабе ўсе магчымыя хвалі эміграцыі і рээміграцыі грамадзян. У дзяржаве пільна кантралявалася рэклама пра замежныя заробкі і магчымасці эміграцыі. Вострыя сацыяльныя праблемы грамадства польскія чыноўнікі спрабавалі вырашаць пры дапамозе перасялення жыхароў Другой Рэчы Паспалітай. Меркавалася, што збяднелая частка сялян з ліку беларусаў і ўкраінцаў павінна выехаць на зробкі ў краіны Лацінскай Амерыкі, а сезонная эміграцыя можа палепшыць матэрыяльны стан сялянства на этнічна польскіх землях.

У студзені 1930 г. было створана таварыства з абмежаванай адказнасцю – Эміграцыйны сіндыкат [2, С. 115]. Асноўную суму ўстаўнога капіталу пры заснаванні таварыства ўклала дзяржава, таму арганізацыя была вымушана дапамагаць патэнцыйным эмігрантам у

афармленні дакументаў бясплатна. Галоўнымі задачамі сіндыката былі: афармленне анкет і бланкаў на візу, дапамога эмігрантам падчас падарожжа (арганізацыя груп, браніраванне білетаў), транспарціроўка багажу. Дзяржава выплачвала сіндыкату ад 0,3 да 3 злотых за кожнага эмігранта, якому была аказана падтрымка і дапамога ў запаўненні дакументаў [1, С. 355]. Сіндыкат быў матэрыяльна зацікаўлены ў росце інтэнсіўнасці эміграцыі, мэтанакіравана стымулявалася міжкантынентальная эміграцыя, бо таварыства дадаткова атрымоўвала прыбытак ад распаўсюджвання карабельных карт.

Сіндыкат быў абавязаны прадстаўляць падрабязную штомесячную і квартальную інфармацыю пра сваю фінансавую дзейнасць. Таварыства з абмежаванай адказнасцю мела разгалінаваную сетку сваіх аддзелаў. Брэсцкі і Пінскі аддзелы шчыльна супрацоўнічалі паміж сабой. Працэдцура рэкрутацыі эмігрантаў у вызначаных аддзелах часта аб’ядноўвалася, там збіралі пасажыраў на адно марское судна, аб’ядноўвалі ў адну групу. Прадстаўнік сіндыката працаваў у кожнай гміне, збіраючы і аналізуючы маштабы эміграцыйнага руху. Раздаваліся лістоўкі з інфармацыяй пра дзейнасць таварыства, якія проста рэкламавалі магчымасці заробкаў за мяжой. Агітацыйны матэрыял быў прадстаўлены ў спецыфічнай форме, лістоўка падкрэслівала: “Пры кожнай адміністрацыі гміны працуе карэспандэнт ці прадстаўнік Эміграцыйнага сіндыката. Звяртайцеся да яго за інфармацыяй і дапамогай у справа эміграцыі. Хто цікавіцца эміграцыяй, няхай чытае сам дадзеную інфармацыю і перадае іншаму” [3]. Падобная агітацыя ў перыяд эканамічных праблем і беспрацоўя 1930-х гг. фарміравала давер чытачоў і давала надзею на працаўладкаванне за мяжой.

Сусветны эканамічны крызіс стаў адной з асноўных прычын рэформы дзяржаўных эміграцыйных органаў, якія прадэманстравалі сваю неэфектыўнасць ва ўмовах эканамічных змен. У 1932 г. адбылася рэарганізацыя эміграцыйнага апарату, у выніку чаго былі пашыраны кампетэнцыі супрацоўнікаў Міністэрства замежных спраў. У 1932 г. ліквідавалі Эміграцыйнае ўпраўленне і Дзяржаўную эміграцыйную раду, а ў 1933 г. распусцілі Дзяржаўнае бюро па працаўладкаванню, замест пералічаных органаў была створана Міжміністэрская эміграцыйная камісія [1, С. 350]. Старшынёй камісіі прызначылі Міністра замежных спраў, са зменай чыноўнікаў на міністэрскай пасадзе камісію ўзначальвалі розныя асобы з ліку міністраў.

На аснове разнастайных груп архіўных гістарычных крыніц можна прасачыць гісторыю фарміравання стуктур эміграцыйных

органаў. У Архіве новых актаў у Варшаве захоўваюцца пратаколы пасяджэнняў Міжміністэрскай эміграцыйнай камісіі. Спіс прысутных у пачатку кожнага пратакола адлюстроўвае высокі статус камісіі. Для абмеркавання праблем перасялення грамадзян збіраліся прадстаўнікі наступных структур: Міністэртва замежных спраў, Міністэрства сацыяльнай апекі, Міністэрства ўнутраных спраў, Міністэрства прамысловасці і гандлю, Міністэрства сельскай гаспадаркі, Міністэрства фінансаў, а таксама Старшыня Рады (Савета) міністраў і прадстаўнікі Дзяржаўнага сельскагаспадарчага банка [4]. Значная ўвага камісіі надавалася пытанням першапачатковай адаптацыі эмігрантаў, аналізу агульнай эміграцыйнай сітуацыі ў краіне, праблемам крэдытавання грамадзян пры перасяленні за межы дзяржавы. З кожным годам склад Міжміністэрскай камісіі пашыраўся, да яе дзейнасці далучаліся супрацоўнікі розных структур Міністэраства замежных спраў.

Кожная краіна-рэцыпіент афіцыйна афармляла патрабаванні да кандыдатаў на эміграцыю, таму польскія чыноўнікі пільна кантралявалі дакументацыю, каб не парушыць міжурадавыя ўмовы пры рэкрутацыі асоб. Патэнцыйны эмігрант павінен быў скласці ліст да структур эміграцыйных дзяржаўных органаў, каб атрымаць дазвол на падрыхтоўку замежнага пашпарта [5, С. 113]. Неабходна падкрэсліць, што замежны пашпарт у Другой Рэчы Паспалітай можна было атрымаць бясплатна.

Кандыдат павінен быў адказаць на пытанні анкетавання пры запаўненні дакументаў на выезд. Статыстычны матэрыял анкет руплiва збіраўся і апрацоўваўся польскімі чыноўнікамі. Напрыклад, анкета для эміграцыі ў Канаду складалася з 22 пытанняў, у якіх неабходна было пазначыць узрост асобы, веравызненне, стан здароўя, кантакты ў прымаючым грамадстве, пералічыць членаў сям'і, акрэсліць вопыт працы ў сельскай гаспадарцы і ўменне чытаць [3, С. 113]. Афіцыйныя дакументы мэтанакіравана апускалі пытанні бланкаў і анкет, дэманстраваўшых нацыянальную ідэнтычнасць асоб. Сучасныя спецыялісты ў галіне эмігрантазнаўства падкрэсліваць праблему вызначэння памераў міжваеннай эміграцыйнай хвалі беларускага насельніцтва, бо прыблізныя падлікі колькасці эмігрантаў абапіраюцца на інфармацыю пра веравызнанне і месца нараджэння грамадзяніна без прамога сведчання пра нацыянальнасць.

Дзяржаўныя польскія органы мэтанакіравана разглядалі і вырашалі пытанні нацыянальных меншасцей у Другой Рэчы Паспалітай. Польскія чыноўнікі актыўна абмяркоўвалі праблему беларусаў, украінцаў, яўрэяў, немцаў як найбольш уплывовых і

колькасных груп нацыянальных меншасцей у дзяржаве. На пасяджэннях эміграцыйных органаў рэгулярна ўздымаліся пытанні пра зніжэнне колькасці этнічна няпольскага насельніцтва ў дзяржаве пры стымуляцыі эміграцыйных працэсаў. Чыноўнікі разнастайных дзяржаўных структур інфармавалі грамадзян пра перспектыву замежных заробкаў, пра праграмы крэдытавання, зніжэнні выплат пры афармленні дакументаў, пра магчымасці аказання дапамогі ў час падарожжа і ў перыяд першапачатковай адаптацыі за мяжой.

ЛІТАРАТУРА

1. Janowska, H. Emigracja z Polski w latach 1918–1939 / H. Janowska // Emigracja z ziem polskich w czasach nowożytnych i najnowszych (XVIII–XX w.). – Warszawa: Państwowe Wydawnictwo Naukowe, 1984. – S. 326–450.

2. Reczyńska, A. Emigracja z Polski do Kanady w okresie międzywojennym / A. Reczyńska. – Wrocław: Wydawnictwo Polskiej Akademii Nauk, 1986. – 223 s.

3. Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці. – Ф. 377. – Воп. 1. – Спр. 1. – Арк. 36.

4. Archiwum Akt Nowych. Sygn. 9895. Str. 3.

5. Марчук, В. Особливості еміграції до Канади з Волинського воєводства II Речіпосполитої в 1930–1939 рр. / В. Марчук, С. Синяк // Український історичний журнал. – 2022. – № 3. –С. 110–118.

УДК 355.233:378.662(476)

А.В. Миронюк, магистр, преп.
(БГТУ, г. Минск)

## ОРГАНИЗАЦИЯ ПОДГОТОВКИ ВОЕННЫХ СПЕЦИАЛИСТОВ НА ВОЕННОЙ КАФЕДРЕ БГТУ

Возникновение систематической военной подготовки на базе гражданских учебных заведениях было обусловлено необходимостью наличия у государств многочисленных армий в связи с увеличением масштабов военных действий. Но даже экономически сильные страны были не в состоянии поддерживать их функционирование в мирное время. Таким образом, возникло противоречие, с одной стороны между необходимостью участия в войне большого количества сил и средств, а с другой – экономической неспособностью государств содержать такое количество войск в мирное время. Для его разрешения большинство европейских государств были вынуждены создавать резерв личного состава. В XX в. в СССР одним из путей формирования